**Л.Я.Клімуць**

# ЕЎРАПЕЙСКАЯ ЗНАЦЬ У ПАРАЎНАЛЬНАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ

У 1936 годзе Марк Блош вызначаў знаць як групу, якая валодае пэўным юрыдычным статусам, атрымоўвае яго па праву нараджэння ці па тых правілах, якія ўстанавіла сама гэтая група. Ён супрацьпастаўляў яе т.зв. *potentes viri*, які ён разумеў як клас дзеяння, а не клас права.[1, 367] Гэта вызначэнне, нягледзячы на тое, што аўтар выкарыстоўвае яго толькі ў дачыненні да французскай арыстакратыі, можа адпавядаць розным сацыяльным групам усёй Еўропы. Але ў гэтым выпадку першачарговым пытаннем павінна стаць: а што з'яўляецца прадметам вывучэння? І як называць сам гэты прадмет: знаць, арыстакратыя, шляхта, дварантсва?

Разнастайныя нацыянальныя тэрміны ў большай ці меншай ступені адпавядаюць лацінскаму слову *nobilis (nobilitas).* Яны вызначаюць ці вялікую значнасць прадстаўнікоў гэтай групы (нямецкае *Adel*), ці асаблівую спадчынную прыроду (чэшскае *шлехта*, польскае і беларускае *шляхта*; абодва паходзяць ад нямецкага *Geschlecht*, што азначае “роднасць”). Шведскі сярэдневяковы тэрмін азначаў “вызвалены ад падаткаў” і, такім чынам, адкрыта падкрэсліваў галоўную прывілею гэтага стану грамадства.

Інтэрпрэтацыя праблемы залежыць ад пункту погляду. З вузкага пункта погляду, нацыянальнага ці нават рэгіянальнага, дамінуе розніца паміж саслоўямі розных краін, якая разбурае гармаінічную, сінтэтычную карціну еўрапейскай знаці. Значыць, для таго, каб дасягнуць параўнальнай перспектывы, трэба знайсці нешта, што можна супрацьпаставіць існуючым поглядам.

Для таго, каб такое параўнанне было магчымым, неабходна вылучыць, якія праблемы трэба разглядаць найперш, а гэта значыць, трэба вызначыць фактары адзінства і розніцы, па якіх можна правесці параўнальнае даследаванне.

Фактары адзінства і розніцы ўключаны ў само азначэнне, але, як ні парадаксальна, часта маюць ідэалагічную або нават міфалагічную прыро-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ду. У эпоху Адраджэння пачынаецца актыўнае стварэнне міфаў аб паходжанні вышэйшых саслоўяў. Уся літоўская знаць, як лічылася, паходзіла ад Палемона, а польская ад Яфета, сына Ноя, па кантрасту з Хамам, продкам сялянства. Міф аб асаблівым паходжанні, відавочна, з'язляецца агульным для ўсёй знаці. Паралельна такім групавым міфам кожны род спрабаваў вызначыць сваю радаслоўную як мага далей у мінулае.

Гледзячы з шырокай еўрапейскай перспектывы, мы павінны ўлічваць яшчэ адну важную рэч: хто вырашаў, ці належыць чалавек да знатнага саслоўя. Цікава параўнаць, па якіх прызнаках у розных краінах чалавека ці яго сям'ю уключалі ў шэрагі знаці ці, наадварот, адмаўлялі ў гэтым. У выключным выпадку з Польшчай ужо ў XV стагоддзі рашэнне аб тым, хто з'яўляецца знатным, вырашала сама знаць. У наступным стагоддзі пасольская ізба сейма ўзяла на сябе прэрагатыву увядзення ў шэрагі знаці. У класічных манархіях гэта прэрагатыва заставалася важным інструментам улады.

Сістэма спадчынных тытулаў была моцным фактарам у развіцці адзінства еўрапейскай эліты. У Еўропе XVI – XVIII стагоддзяў гэтыя тытулы толькі фармальна былі падобныя на сярэдневяковыя германскія і лацінская назвы. Гэтыя тытулы сталі проста сістэмай спадчынных рангаў, якую разумелі ва ўсіх краінах.

Аднак яна была недакладнай. У пазнейшыя часы у прыдворным грамадстве кожны быў па меньшай меры графам, і ў дзеянне ўступалі іншыя фактары, якія больш вызначалі становішча чалавека ў грамадстве, чым проста тытул: блізкасць да прынца, прэстыж сям'і, роднасць па крыві ці багацце. Прыдворнае грамадства не магло існаваць без знаці, але адносіны паміж дваром і знаццю яшчэ да канца не вывучаны. У некаторых краінах двары арыстакратаў ці магнатаў супернічалі з каралеўскімі як цэнтры культуры і ўлады.

Безумоўна, сувязі паміж цэнтрамі ўлады і астатняй краінай былі моцнымі і неабходнымі для дзяржавы. Але трэба растлумачыць розніцу ў адносінах паміж цэнтрам і перыферыяй, дваром і краінай і г.д. Магчыма, канкрэтнае становішча асобнага прадстаўніка знаці можна найлепш зразумець, калі мы ўявім яго як звязуючае звяно паміж цэнтрам улады – двор прынца ці адміністрацыйныя інстытуты – і мясцовымі уладаннямі і мясцовым уплывам. Гэта адкрывае праблему "патрон-кліент".

Патранаж быў звычайным тыпам адносінаў, але ў розным асяродку ён адыгрываў розныя ролі. Сярод праблем, якія можна вылучыць для абмеркавання, — функцыі і наступствы патранажу.

Цікавасць уяўляе і праблема адносінаў знаці да насілля. Адносіны да прымянення сілы сярод самой знаці сведчаць пра т.зв. цывілізацыйныя працэсы ці яе мадэрнізацыю. Гэты працэс сведчыць аб узрастанні ролі закона і дзяржаўнай адміністрацыі, але таксама і аб зменах у маралі і звыча-

ях. Але былі і краіны-выключэнні. У Рэчы Паспалітай яшчэ ў XVIII стагоддзі звычайнымі былі (і лічыліся правільнымі і законнымі) ваенныя дзеянні магнатаў адзін супраць аднаго.

Адзінага адказу на пытанне, чаму знаць прыходзіць у заняпад, няма. Масавае ўвядзенне ў ранг знаці паспяховай буржуазіі ці каралеўскіх слуг, а таксама дэвальвацыя арыстакратычных дабрадзейнасцяў былі небяспечныя для арыстакратыі крыві і зніжалі каштоўнасць самога знатнага звання. Але само пытанне заняпаду знаці к XIX стагоддзю спрэчнае. Аналіз складу дзяржаўных органаў той ці іншай краіны можа даказаць, што працэс, які назіраўся, быў не заняпадам знаці, а зменай яе амбіцый і арыентацый, што суправаджалася, безумоўна, заняпадам некаторых знатных родаў.

### *Літаратура*

1. ***Marc Bloch.*** "Feudal Society" Oxford Press, 1971.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова